вымярэнне НКС прадвызначае дыялагічны патэнцыял апошняй у кантэксце страты геалакальнасці і набыцця новай экстратэрытарыяльнай абумоўленасці.


1. *Алексеев, Э.* Фольклор в контексте современной культуры : рассуждения о судьбах народной песни / Э. Алексеев. – М. : Советский композитор, 1988. – 237 с.

2. *Блок, М.* Апология истории, или Ремесло историка / М. Блок. – М. : Наука, 1986. – 254 с.

3. *Геттнер, А.* География. Её история, сущность и методы / А. Геттнер, М. ; Ленинград : Государственное издательство, 1930. – 416.

4. *Мастеница, Е. Н.* Наследие в музее : границы и горизонты интерпретации / Е. Н. Мастеница // Музей и нематериальное культурное наследие : сб. тр. – М., 2005. – Вып. 6. – С. 60–64.

5. *Ратцель, Ф.* Человечество как жизненное явление на земле / Ф. Ратцель. – М. : URSS : Либроком, 2011. – 56 с.

6. *Giddens, A.* Social Theory and Modern Sociology / A. Giddens. – Stanford : Stanford University Press, 1987. – 310 p.

7. *Hall, E.* Distances in Man / E. Hall // The Hidden Dimension. – Garden City, N.Y. : Doubleday, 1966, P. 113–129.

8. *Holt-Jensen, A.* Geography: History and Concepts / A. Holt-Jensen. – London : SAGE, 1999. – 228 p.

9. *Redfield, R.* Memorandum for the Study of Acculturation / R. Redfield, R. Linton, M.J. Herskovits // American Anthropologist. – 1936. – Vol. 38, No. 1. – P. 149–152.

10. *Sauer, C.* The Morphology of Landscape / C. Sauer // Land and Life : A Selection from the Writtings of Carl Ortwin Sauer / edited by J. Leighly. – Los Angeles, London : University of California Press, 1983. – 435 p.



***А. І. Марэцкі,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры філасофіі*


# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ФАРМІРАВАННЯ ТАЛЕРАНТНАСЦІ Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

Апошнія стагоддзі з’явіліся яркай дэманстрацыяй надзвычай супярэчлівай чалавечай натуры. Менавіта ў гэты час, з аднаго боку, чалавецтва здзейсніла значныя навуковыя адкрыцці. З іншага боку, у гэты ж час былі развязаны самыя жорсткія войны, адбыліся сацыяльныя перавароты, якія выклікалі, у сваю чаргу, жорсткія формы эксплуатацыі людзей, знявагу да іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыцця, правоў, маралі. Новы век прынёс і новыя формы рабства, расавай і рэлігійнай нецярпімасці, выклікаў новыя разбурэнні, пазбавіў мільёны людзей іх правоў, прынёс новыя знявагі. Войны ў Іраку, Лівіі, Сірыі, бамбардзіроўкі Югаславіі, ваенныя падзеі на ўсходзе Украіны, тэрарызм ісламскіх баевікоў і іншыя падзеі – яскравы прыклад сказанага вышэй.

Сярод передумоў пераадолення такіх негатыўных з'яў трэба адзначыць выхаванне і фарміраванне талерантнасці, якая заснавана на ўзаемнай павазе, гуманізацыі, уменні ўзаемнага абагачэння і дыялогу. Таму адзначым, што найбольш важным годам для абмеркавання названых праблем стаў 1995-ты, які быў аб'яўлены ЮНЕСКА Годам талерантнасці. Каля 180 дзяржаў прыйшлі да адзінага пункту погляду па пытанні выхавання такой неабходнай з'явы ў культуры чалавецтва, як культура свету. На тое была вельмі важкая падстава, паколькі міжнацыянальныя адносіны ў структуры грамадства пагаршаліся ў сувязі з тым, што змяняліся раней дзеючыя рэгулятары выхаваўчай работы ў школах і іншых сацыяльных інстытутах.

Паняцце талерантнасці разглядаецца ў літаратуры ў розных аспектах. Так, у слоўніку С. І. Ажэгава яно адсутнічае – ёсць паняцці «церпялівы», «цярпімы» і г. д. Цярпенне разглядаецца як здольнасць цярпець, як настойлівасць, упартасць, вытрымка ў якой-небудзь справе. Аналагічна трактуе яе В. І. Даль [2, с. 87]. Іншыя даследчыкі змяшчаюць акцэнт на актыўную маральную пазіцыю і псіхалагічную гатоўнасць для пазітыўнага ўзаемадзеяння з людзьмі іншай культуры, нацыі, рэлігіі, сацыяльнага асяроддзя.

У работах Д. В. Зіноўева, В. А. Лектарскага, Т. В. Паштарова, О. Хофе талерантнасць разглядаецца як павага да чужой пазіцыі ў спалучэнні на вызначэнне ўзаемных змяненняў пазіцый у выніку крытычнага дыялогу [1, с. 46–54].

Крыху па-іншаму трактуецца талерантнасць у псіхалогіі – гэта адсутнасць ці аслабленнне рэагавання на які-небудзь неспрыяльны фактар у выніку паніжэння чуллівасці да яго ўздзеяння. У палітыцы талерантнасць разглядаецца як гатоўнасць улічваць іншыя меркаванні, прымальнасць апазіцыйных палітычных сіл, здольнасць да пошуку ісціны шляхам дыскусіі.

Наяўнасць разнастайных падыходаў да вызначэння паняцця талерантнасці, а таксама форм яго практычнага прымянення ўказвае на неабходнасць выхавання гэтай якасці ў працэсе як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асабістага, так і прафесійнага развіцця. Справа ў тым, што талерантнасць пры любых спалучэннях забяспечвае міралюбства, бесканфліктнасць пры захаванні перакананняў і прынцыпаў, гэта значыць – аўтаномнасць пазіцыі.

Аднак у сучасных нестабільных сацыяльна-эканамічных умовах імкненне захаваць нацыянальную самабытнасць характарызуецца часам негатыўнай рэакцыяй. У многіх людзей узнікае асцярога перад магчымым ушчамленнем нацыянальнай годнасці, якая можа праявіцца як у форме халоднай абыякавасці, немагчымасці паразумення, так і ў праяўленнях варожасці, агрэсіі ў адносінах да людзей іншага этнасу.

Талерантнасць жа азначае неабходнасць не толькі жыць у згодзе з народамі іншай расы, нацыянальнасці, рэлігіі ці светапогляду, але і ўспрымаць іх як натуральную з’яву, як багацце і ўнікальнасць чалавечай цывілізацыі. Гэта азначае таксама прызнанне разнастайнасці свету, непаўторнасць і ўнікальнасць кожнага чалавека, плюралізм поглядаў і культур.

Сацыяльныя ўмовы пражывання людзей розных нацыянальнасцей ставяць перад грамадствам задачы выхавання асобы, якая ўмее ў розных сітуацыях праяўляць вытрымку, маральныя прынцыпы, цярпімасць да розных меркаванняў. Частка моладзі не можа вырашыць складаныя пытанні, зрабіць самастойны выбар, праявіць прынцыповасць па шэрагу пытанняў, а гэта садзейнічае праяўленню нацыянальнай непрыязнасці.

Ажыццяўляючы гуманістычны падыход у выхаванні, мы ствараем прымальныя ўмовы гарманічнага ўзаемадзеяння ў міжнацыянальным асяроддзі, дзе галоўным крытэрыем фарміравання асобы можна лічыць здабыты вопыт талерантнага ўзаемадзеяння з навакольным асяроддзем. Ён у значнай ступені вызначае лёс чалавека ў будучым. Талерантнасць у гэтым выпадку абрастае многімі рысамі характару, якія праяўляюцца ў разнастайнай дзейнасці з усімі аспектамі і робяць жыццядзейнасць чалавека гарманічнай ці дысгарманічнай.

Пры разглядзе талерантнасці як неабходнага прынцыпу міжкультурных зносін важнае значэнне трэба надаць праблеме вывучэння і адраджэння агульначалавечых культурных традыцый, якія аб'ядноўваюць людзей ва ўсе часы. У гэтых адносінах адна з іх функцый заключаеццца ў забеспячэнні пераемнасці паміж пакаленнямі і эпохамі. Тут традыцыі выступаюць адначасова і як набытак мінулага, і як праекцыя ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

будучае. Ва ўсіх культурах яны ўзніклі ў працэсе працоўнай дзейнасці, адлюстроўвалі і суправаджалі яе. Таксама ў многіх нацый яны выконвалі такія функцыі, як рэгулятыўная, маральная, каштоўнасная, выхаваўчая. Дзякуючы фіксацыі найбольш аптымальных схем і правілаў добрасуседства, культурныя традыцыі выступаюць як праграма і сістэма дзейнасці. Кожны народ мае свае культурныя традыцыі, якія адлюстроўваюць характар яго працы, культуры, побыту. У іх выяўляюцца ўласцівыя дадзенаму этнасу стыль, прыёмы, метады адлюстравання рэчаіснасці. У нацыянальным адлюстроўваецца гісторыя народа, сувязі і зносіны з іншымі народамі. Традыцыі праз мову, мастацтва, характар людзей выяўляюць своеасаблівасць, непаўторнасць нацыі. Культурныя традыцыі ўтрымліваюць у сабе агульначалавечыя рысы, якія сталі агульнымі ці блізкімі па сваім змесце многім народам, нягледзячы на нацыянальнае адрозненне.

Вывучэнне такой спадчыны садзейнічае фарміраванню культуры талерантнасці і пазбаўленню грамадства і асобы ад насілля. У сувязі з тым, што культурныя традыцыі фарміруюць здольнасці да самаабмежавання, яны дапамагаюць развіць уменне адрозніваць дабро ад зла. Для пераадолення нецярпімасці трэба навучыцца паважаць культуру, традыцыі, асаблівасці іншых народаў.

Фарміраванне культуры талерантнасці павінна базіравацца на гістарычнай памяці народаў. Людзі, якія пазбаўлены сваіх культурных традыцый, прадстаўляюць сабой патэнцыяльных разбуральнікаў. Таму адукацыя і выхаванне сёння павінны насіць міжкультурны характар. Веданне сваёй і чужой культуры не толькі пашырае кругагляд чалавека, узбагачае яго духоўна, але і выконвае надзвычай важную выхаваўчую функцыю прышчэпкі ад комплексу нацыянальнай выключнасці.

Гістарычная памяць звязана з устойлівасцю, з'яўляецца інтэгральнай характарыстыкай асобы, якая дэтэрмінуе ўсе асноўныя працэсы ў ёй: матывы адукацыі, магчымасць фарміравання надсістэмнай актыўнасці, прынядце кардынальных рашэнняў у тых ці іншых сітуацыях. Здольнасць чалавека захоўваць і рэалізоўваць у іх свае асабістыя пазіцыі праяўляецца ў яго пераўтваральнай дзейнасці.

На наш погляд, прафесійная ўстойлівасць асобы выступае як інтэгральная яе якасць, што выражаецца ў актыўным узаема-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеянні прафесійнай накіраванасці, прафесійнай самасвядомасці і гатоўнасці да самастойнага паспяховага выканання прафесійных функцый; як якасць дзейнасці, якая прыносіць задавальненне; як сістэма, што ўключае ў сябе сінтэз матывацыйнай, эмацыянальна-валявой, кагнітыўнай падсістэм, змест якіх адлюстроўвае спецыфіку прафесійнай дзейнасці. Пры гэтым вядучым, па нашым меркаванні, з’яўляецца матывацыйны кампанент, што прадвызначае далейшую прафесійную дзейнасць.

А. А. Пагодзіна ва «Уроке толерантности» праводзіць сувязь паміж талерантнасцю і ўстойлівасцю асобы. Яна вызначае ўстойлівасць асобы як сфарміраванасць сацыяльна-маральных матываў, паводзін яе ў працэсе ўзаемадзеяння з людзьмі іншых этнічных супольнасцей. Устойлівасць з'яўляецца адным з крытэрыяў талерантнасці. Паказчыкамі ўстойлівасці даследчык называе эмацыянальную стабільнасць, добразычлівасць, ветлівасць, цярпенне, сацыяльную адказнасць, самастойнасць, сацыяльную рэлаксацыю [3, с. 57–64].

Сучасныя патрабаванні да спецыяліста гуманітарнага профілю ўключаюць прафесіяналізм, высокія маральныя ўзоры паводзін, садзейнічанне развіццю грамадства. З дапамогай уключэння ў працэс выкладання псіхалагічных дысцыплін, трэнінгавых практыкаванняў, якія накіраваны на згуртаванне групы (фарміраванне навыкаў актыўнага слухання, уменняў і жадання разумець субяседніка, навучанне адэкватным дзелавой сферы выяўлення пазітыўных ці негатыўных эмоцый, дыягностыка і карэкцыя студэнтамі асабістай напружанасці, развіццё здольнасці вызначаць свае пазіцыі, каштоўнасныя арыентацыі, супрацьстаянне супярэчлівым уздзеянням) магчыма павышэнне ўзроўню талерантнасці як адной з умоў фарміравання прафесійнай устойлівасці спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі.


1. *Лекторский, В. А.* О толератности, плюрализме и критицизме. Вопросы философии / В. А. Лекторский.1997. – № 11.

2. *Даль, В. И.* Толковый словарь живого великорусского языка / В. И. Даль. – М., Прогресс-Универс, 1994. – Т. 4.

3. *Погодина, А. А.* Толерантность: термин, позиция, смысл, программа. История, 2002. – № 11. – Издательский дом «Первое сентября», 2002.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ